**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**народны хор «Радзейка»**
**УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў**
**імя Н.Ф.Сакалоўскага»**

Народны хор «Радзейка» быў створаны ў 1985 годзе пад кіраўніцтвам Бабкова Ігара Іванавіча. У 2004 годзе за высокі мастацкі ўзровень калектыву было прысвоена найменне «народны аматарскі калектыў», а ў 2017 годзе загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2017 № 76 калектыў атрымаў званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

Канцэрты хору адрозніваюцца разнастайнасцю тэматычных праграм як для дарослай, так і для юнацкай аўдыторый, карыстаюцца вялікай павагай у слухачоў. Калектыў вылучаецца высокім мастацкім і выканальніцкім узроўнем, артыстызмам і сцэнічным майстэрствам.

Кожны нумар хору мае сваю рэжысуру, творчы вобраз. Кампазіцыі адрозніваюцца па характару, складанасці, але заўсёды своеасаблівыя і цікавыя, яны фарміруюць цэласнасць канцэртнай праграмы.

Кіраўнік хору – Баруценка Аксана Уладзіміраўна. Аксана Уладзіміраўна (1974 г.н.) скончыла УА «Гомельскае музычнае вучылішча імя Н.Ф.Сакалоўскага» ў 1993 годзе па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне (народны хор)». У 1993 годзе паступіла ва УА «Мінскі інстытут культуры» на факультэт «Мастацкая творчасць», кафедра «Народна-песенная творчасць». З 1998 года працуе ва УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага». З 1999 па 2003 год, з 2010 і па сённяшні час з'яўляецца кіраўніком Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага хору «Радзейка».

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны хор «Радзейка» УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага» вядзе актыўную канцэртную дзейнасць і пастаянна прадстаўляе Гомельскую вобласць на абласных, раённых, міжнародных і Рэспубліканскіх мерапрыемствах.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны хор

«Радзейка» УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага» пастаянна ажыццяўляе вялікую творчую, культурна-асветніцкую і вучэбна-выхаваўчую дзейнасць.

Народны хор «Радзейка» штогод дае шмат канцэртаў для жыхароў горада Гомеля і вобласці, паспяхова прымае ўдзел у розных фестывалях і конкурсах, грамадскіх мерапрыемствах.

У 2017 годзе – за значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, высокі мастацкі ўзровень і творчыя дасягненні рашэннем Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прысвоена званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь» народнаму хору «Радзейка» УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага».

